– вызначыць на слых гарманічныя паслядоўнасці;

– падабраць да музычнага твора ў адпаведнасці з яго вобразным строем творы літаратуры і жывапісу;

– параўнаць выканальніцкія планы музычнага твора ў іх розных рэдакцыях;

– знайсці ў музычным творы вядучыя інтанацыі і апорныя пункты, адпаведна якім развіваецца музычная думка;

– скласці некалькі выканальніцкіх планаў аднаго і таго ж музычнага твора;

– выканаць твор з рознай аркестроўкай.

Пры выкананні праблемных заданняў карысныя дыскусіі і абмеркаванні, якія прымушаюць студэнтаў дакладна фармуляваць сваю думку, пазіцыю, рабіць неабходныя вывады.

Музычны твор у рэальным гучанні існуе ў незлічонай колькасці разнастайных выканальніцкіх трактовак. Стымуляванне педагогам варыятыўнага падыходу пры вывучэнні музычнага твора, будовы некалькіх выканальніцкіх планаў аднаго і таго ж твора вядзе да фарміравання ў студэнта багатага творчага ўяўлення, павышае мастацкую выразнасць выканальніцкай ігры.

Такім чынам, самастойнае вырашэнне студэнтамі розных выканальніцкіх задач не толькі патрабуе набыцця адпаведных уменняў, навыкаў, самакантролю, самадысцыпліны, але і кіравання, дапамогі педагога, сумесных з ім творчых пошукаў.

**В.М. Валатковіч,** *дацэнт*

## РОЛЯ РЭЙТЫНГАВАЙ СІСТЭМЫ КАНТРОЛЮ Ў ВУЧЭБНЫМ ПРАЦЭСЕ

(факультэт музычнага мастацтва)

Выкарыстанне рэйтынгавай сістэмы кантролю вучэбнай работы студэнтаў дазваляе павысіць узровень арганізаванасці навучальнага працэсу, палепшыць навукова-метадычную дзейнасць выкладчыкаў, устанавіць эфектыўную зваротную сувязь студэнтаў, выкладчыкаў, дэканата і кафедраў. Бягучыя рэйтынгі садзейнічаюць актывізацыі вучэбнай дзейнасці студэнтаў, атрыманню кафедрамі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб'ектыўных даных для арганізацыі навучання па шматузроўневай сістэме.

Рэйтынгавая сістэма ацэнкі ведаў студэнтаў на факультэце музычнага мастацтва была ўведзена ў 2005 г. Нельга сказаць, што яна ў нас адразу атрымалася і запрацавала. Было шмат пошукаў, невядомага і спрэчнага. Але час ішоў, і мы паступова знаходзілі патрэбныя вучэбнаму працэсу формы і метады рэйтынгавай сістэмы ацэнкі ведаў студэнтаў.

Кафедры вызначылі ўмовы прымянення рэйтынгавай сістэмы спачатку па асноўных, а потым па ўсіх вучэбных дысцыплінах з улікам вучэбнай і вытворчай практыкі і самастойнай работы, таму што самастойная работа з'яўляецца адным з асноўных кірункаў у рэфармаванні сістэмы адукацыі.

Распрацаваны табліцы размеркавання рэйтынгавых адзнак і балаў (працэнтаў) па відах дзейнасці і формах удзелу студэнта ў вучэбным працэсе і ацэначныя лісты. Уліку сталі падлягаць розныя прадугледжаныя вучэбна-метадычнай дакументацыяй віды дзейнасці студэнта: выкананне самастойнай або практычнай работы, вывучэнне харавой ці аркестравай партытуры, веданне харавых, інструментальных партый, падрыхтоўка анатацый, напісанне кантрольных работ, прамежкавае тэсціраванне, наведванне заняткаў і інш. Кожны від дзейнасці ацэньваецца ў балах у адпаведнасці са ступенню складанасці задання і ўзроўнем творчага падыходу пры яго выкананні.

Акрамя абавязковых балаў, студэнтам налічваюцца *прэміяльныя балы* за дадатковую аўдыторную і пазааўдыторную, канцэртную, навуковую дзейнасць і інш., а таксама *памяншальныя балы* за пропускі заняткаў без уважлівых прычын, за невыкананне заданняў па самастойнай рабоце, за няяўку на канцэртныя выступленні без уважлівых прычын, за несвоечасовае выкананне кантрольных і курсавых работ і інш.

Рэйтынг вызначаецца ў % ад максімальнай колькасці балаў (100%) і ўзгадняецца з 5-(10)бальнай ацэнкай якасці ведаў па шкале, якая распрацавана на факультэце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Колькасць балаў, % | 5-бальная сістэма | 10-бальная сістэма |
|---|---|---|
| 100 і вышэй | 5+ | 10 |
| 95–99 | 5 | 9 |
| 90–94 | 5- | 8 |
| 85–89 | 4+ | 7 |
| 80–84 | 4 | 6 |
| 75–79 | 4- | 5 |
| 70–74 | 3+ | 4 |

Да выніковай ацэнкі ведаў (заліку, экзамену) дапускаюцца студэнты, якія набралі не менш за 70% ад максімальнай колькасці балаў (100%). Калі рэйтынг меншы, студэнт павінен выканаць усе віды заданняў, якія прадугледжаны па вучэбнай дысцыпліне, і набраць рэйтынг, неабходны для допуску да заліку (экзамену).

У склад 70% рэйтынгавых балаў павінны ўваходзіць абавязковыя 50% рэйтынгавых балаў, атрыманых за розныя віды вучэбных заняткаў і пазааўдыторнай самастойнай работы, а таксама 20% – за наведванне заняткаў (што ў выніку і складае 70% рэйтынгу).

Сумарны рэйтынг студэнта па дысцыпліне ўлічваецца выкладчыкам пры прыёме залікаў і экзаменаў.

Для атрымання заліку ("аўтаматам") студэнт павінен набраць 80%. Студэнты, якія не выканалі ўмовы рэйтынгу, здаюць залік на агульных падставах.

Выніковая адзнака выстаўляецца на падставе сумы балаў, якая складаецца з сумарнага рэйтынгу студэнта па дысцыпліне (у %) і бала, атрыманага на экзамене (у %). Пры гэтым балы на экзамене налічваюцца толькі ў тым выпадку, калі студэнт дэманструе здавальняючыя веды па прадмеце. У выпадку нездавальняючага адказу на экзамене (заліку) у ведамасць выстаўляецца нездавальняючая выніковая адзнака па дысцыпліне, і студэнт павінен здаваць экзамен (залік) паўторна.

Такім чынам, выніковы рэйтынг вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнта фарміруецца як вынік сумарных рэйтынгаў па вучэбных дысцыплінах. Ён дазваляе інтэгральна ацаніць паспяховасць студэнта і выкарыстоўваецца пры налічэнні стыпендыі і прымяненні розных формаў маральнага і матэрыяльнага заахвочвання.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Ранжыраванні відаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў амаль на ўсіх кафедрах розныя. Так, на харавых кафедрах па прадмеце "Дырыжыраванне" яны выглядаюць наступным чынам:

| | |
|---|---|
| наведванне заняткаў | да 30 |
| тэхніка дырыжыравання, мастацкае раскрыццё зместу | да 16 |
| ігра партытур (творы a cappella на памяць) | да 8 |
| спевы галасоў, акордаў (у творах a cappella на памяць) | да 8 |
| рэйтынгавы бал па рубежным кантролі | да 12 |
| наяўнасць анатацый і якасць іх зместу | да 6 |
| якасць самастойнай работы | да 8 |
| вытворчая і педагагічная практыка | да 6 |
| дыпломная работа | да 6 |

Прэміяльныя балы

| | |
|---|---|
| удзел у навукова-даследчай рабоце і наяўнасць публікацый | да 4 |
| выступленні на канферэнцыях | да 4 |
| праца ў аматарскіх калектывах мастацкім кіраўніком | да 4 |

Памяншальныя балы

| | |
|---|---|
| адсутнасць на занятках без уважлівых прычын | да 2 |
| невыкананне задання па самастойнай рабоце | да 2 |
| няяўка на канцэрт без уважлівых падстаў | да 2 |

На кафедры тэорыі музыкі і музычнай адукацыі па кожнаму прадмету распрацавана свая, даволі цікавая і падрабязная рэйтынгавая сістэма ацэнкі ведаў студэнтаў. Напрыклад, па паліфаніі ўвесь курс падзелены на блокі, а блокі ў сваю чаргу – на тэмы і віды работ.

Блок №1 "Віды паліфаніі" (16 гадз. лаб., 12 гадз. самастойных заняткаў):

| | |
|---|---|
| наведванне – за кожную пару аўдыторных заняткаў | + ½ |
| надрыхтаванасць – за кожную пару аўдыторных заняткаў | + ½ |

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Пісьмовая работа "Мелодыя строгага стылю" 10 р/б

Балы налічваюцца ці здымаюцца за:

| | |
|---|---|
| своечасовасць: за кожны пратэрмінаваны тыдзень | – 1 |
| сачыненне адной мелодыі | + 2 |
| выпраўленне памылак у чужой рабоце – за ўсю работу | + 2 |
| і г.д. | |

На кафедры народна-інструментальнай творчасці распрацавана свая рэйтынгавая сістэма, якая мае наступны выгляд:

| | |
|---|---|
| здача экзамену | да 18 |
| наведванне заняткаў | да 28 |
| актыўнасць на занятках | да 4 |
| рэйтынгавы бал па рубежным кантролі | да 14 |
| тэхніка дырыжыравання, мастацкае раскрыццё зместу твора | да 12 |
| калёквіум | да 8 |
| веданне партытуры | да 8 |
| якасць самастойнай работы | да 8 |

Усяго: 100 р/б

Прэміяльныя балы

| | |
|---|---|
| выступленне на навуковых канферэнцыях | да 6 |
| наяўнасць публікацый | да 8 |
| удзел у навукова-даследчай рабоце | да 4 |
| праца ў аматарскіх калектывах | да 6 |
| прэміяльны рэйтынгавы бал, які выкладчык можа выставіць студэнту за высокія паказчыкі ў вучобе і грамадскай дзейнасці | да 4 |

Памяншальныя балы

| | |
|---|---|
| 1. Адсутнасць на індывідуальных занятках без уважлівых падстаў | 2 |
| 2. Нездавальняючы адказ па тэарэтычных пытаннях | 2 |
| 3. Невыкананне заданняў па самастойнай рабоце | 2 |
| 4. Няяўка на канцэрты без уважлівых падстаў | 4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, на факультэце праведзена пэўная работа па ўкараненні рэйтынгавай сістэмы ацэнкі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў для павышэння якасці адукацыйнага працэсу з улікам спецыфікі вучэбных дысцыплін. Рэйтынгавая сістэма можа стаць эфектыўным інструментам у паляпшэнні якасці калектыўна-выканальніцкай дзейнасці на факультэце (аркестравы, харавы класы; класы інструментальных і вакальных ансамбляў). Трэба адзначыць, што рэйтынгавая сістэма прадугледжвае вызначэнне ўдзельнай вагі кожнага віду студэнцкай працы, яе выкарыстанне дапамагае наладзіць супрацоўніцтва і гарманізаваць адносіны паміж выкладчыкам і студэнтам. Практыка выяўляе як моцныя, так і слабыя месцы рэйтынгавай сістэмы, што дазваляе яе ўдасканальваць.

---

1. *Лобанов, А.П.* Управляемая самостоятельная работа студентов в контексте инновационных технологий / А.П. Лобанов, Н.В. Дроздова. – Мн.: РИВШ, 2005. – 107 с.

2. *Сергеенкова, В.В.* Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В.В. Сергеенкова. — Мн.: РИВШ, 2004. — 132 с.

**Л.Ф. Голікава,** *дацэнт*

## АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ
(кафедра тэатральнай творчасці)

У пачатку XXI ст. перад вышэйшай школай, як ніколі раней, паўстае пытанне выпрацоўкі аптымальных патрабаванняў да ўзроўню падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. У творчых ВНУ, у тым ліку і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, у сувязі з гэтым актуальнай і перспектыўнай бачыцца сучасная канцэпцыя вышэйшай адукацыі, якая арыентуе студэнта на канчатковы вынік у авалоданні прафесіяй, у чым вялікую ролю адыгрывае самастойная работа кожнага навучэнца, а тым больш – будучага рэжысёра, высокакваліфікаванага спецыяліста, які падрыхтаваны як да творчай, педагагічнай, так і да навукова-творчай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ